Літабсягі

# Калі ў храме душы месца радасці ёсць

Паліна ЯРЦАВА,
фота Кастуся Дробава

**У межах сацыяльнай выстаўкі-кірмашу "50+", арганізаванай Мінгарвыканкамам з мэтай падтрымкі людзей сталага ўзросту, прайшла літаратурна-музычная праграма Мінскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і выдавецтва "Чатыры чвэрці" "Словы дабрыні ў нашых сэрцах".**



Мэтай выстаўкі-кірмашу была не толькі арганізацыя ільготнага продажу тавараў, кансультацыі розных спецыялістаў, але і змяненне псіхалогіі старэйшага пакалення. "За пяцьдзясят" — час, калі, валодаючы добрым досведам, можна зрабіць сваё жыццё насычаным і цікавым, перачытаць тое, на што некалі не хапіла часу, урэшце — самому напісаць кнігу. Прыемна было пазнаёміцца з людзьмі, якія ў элегантным узросце пачыналі "новае жыццё", рэалізоўвалі даўнія мары: Надзея Канашкіна, чые ручнікі ўпрыгожвалі вечарыну, толькі нядаўна знайшла час прысвяціць сябе вышыўцы; доктар мастацтвазнаўства Юлія Чурко выдала некалькі кніг прозы.

Для тых, каму за пяцьдзясят, на сцэне канферэнц-залы выступалі паэты, пісьменнікі, барды, чые кнігі ўбачылі свет у выдавецтве "Чатыры чвэрці", а вядучай вечарыны была Ліліяна Анцух, пісьменніца, дырэктар гэтага выдавецтва. Не пакінулі абыякавымі слухачоў выкананыя аўтарамі ўрывак з новай кнігі Наталіі Касцючэнкі "Вярба над вірам", вершы Міхася Пазнякова, Зіновія Прыгодзіча, Лізаветы Палеес, Яны Явіч, Вольгі Нарынай, Вольгі Сакаловай.

Старшыня гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў акцэнтаваў увагу прысутных на тым, што дзейнасць творчай суполкі — не толькі вялікая колькасць выступленняў, якія ахопліваюць аўдыторыю ад дзіцячых садкоў да Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, але і праца з маладымі талентамі: выяўленне іх з дапамогай літаратурных конкурсаў, правядзенне вучобы ў межах студый і семінараў, а таксама выданне кніг, у тым ліку ў адметных серыях "Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі" і "Мінскія маладыя галасы".

Праграма была шчодрай на падарункі: бліскуча выступілі артыстка Аляксандра Іванова і піяністка Марына Рамейка, баяніст Рыгор Хвясевіч, уразіла гучанне класікі ў афарбоўцы лічбавага баяна ў выкананні прафесара БДУКіМ Васіля Глубачэнкі, песні на вершы Купалы і Караткевіча пад гітару спяваў Дзмітрый Пятровіч, разам з кандыдатам педагагічных навук бардам Валянцінам Кавалівам зала выканала песню з кінастужкі "Зямля Саннікава" — "Есть только миг".

***На здымку:** пісьменнікі Лізавета Палеес і Валянцін Маслюкоў прапануюць кнігі наведвальнікам выстаўкі-кірмашу.*